Чорнаіваненка Вераніка

Вучаніца 10 класа сярэдняй школы №1 гп Рось

Беларусь-краіна стабільнасці

Нашай краіне ўдалося захаваць мір і стабільнасць(адной з нямногіх краін на постсавецкай прасторы). Гэта дапамагае спросціць задачу па ўстойліваму развіццю. Па статыстыцы ў 2016 годзе 5.7% грамадзян афіцыйна адносілася да каэгорыі малазабяспечаных. Да 2020 года гэты паказчык зменшыцца ў два разы шляхам развіцця сацыяльнай структуры. У глабальным рэйцінгу харчовай бяпекі Беларусь займае 46 месца і 25 месца сярод самых камфортных краін для мацярынства.

Беларусь , як мы бачым, можна з упэўненасцю назваць добра развітай краінай.Але ці трэба прыпняцца на дасягнутым ? Безумоўна, трэба ісці далей .

Для далейшага развіцця краіны патрэбны “светлыя галавы” падрастаючага пакалення . Сучасныя дзеці па-новаму глядзяць на праблемы сучаснасці і смела фармулююць новыя прагрэсіўныя ідэі. Таму так важна надаваць асаблівую ўвагу выхаванню і адукацыі маладога пакалення . Пачынаць выхоўваць духоўную адукаванасць і новае ўспрыняцце свету трэба  змалку. У гэтым выпадку мы павінны браць прыклад з паўднёвых краін . У гэтых  краінах з пачатковых класаў дзяцей вучаць спачатку правільным паводзінам ,а толькі потым  грамаце. Уменне правільна паводзіць сябе з людзьмі можа сыграць вялікую ролю ў рэалізацыі новых ідэй(ніхто не будзе слухаць і браць на працу чалавека , які непрыемна сябе паводзіць).

Я лічу, што адной з галоўных перашкод на шляху ўстойлівага развіцця нашай краіны з’яўляецца не вельмі эфектыўная барацьба са шкоднымі звычкамі. У гэтым накірунку трэба прымяняць больш жорскія меры. Продаж тытуню і алкаголю ,безумоўна,  з’яўляецца неад’емнай часткай гандлю Беларусі і атрымання прыбытку. Рашэнне , я лічу, можна знайсці ў павелічэнні кошту на алкагольныя і тытуневыя вырабы і зніжэнне кошту на сацыяльна значымыя прадукты (хлеб, малочную прадукцыю і г.д.). Таксама стварэнне спрыяльных умоў для заняткаў спортам не толькі ў вялікіх населеных пунктах , але і ў маленькіх вёсках, пасёлках, аграгарадках(мы абавязаны прадуктамі харчавання працаўнікам гэтых мясцін, але падзякі не выказваем).

Інавацыі ў нашай краіне павінны ўкаранцца больш актыўна .Але галоўнае не хуткасць і навізна , а якасць і карыснасць . Хочацца звярнуць увагу на многія бедныя паўднёвыя краіны , у якіх няма самых простых рэчаў , а ў Беларусі яны ёсць у дастатку. Аднак і ў нас ёсць малазабяспечаная частка насельніцтва. Дзяржава падтрымлівае такіх грамадзян шляхам адраснай дапамогі , але трэба

дацьмагчымасць зарабляць дастаткова  самім людзям . Яшчэ больш эфектыўнае скарачэнне малазабяспечаных – адна з галоўных задач нашай краіны на сучасным этапе .

Важным накірункам устойлівага развіцця нашай краіны ,я лічу, з’яўляюцца і добрыя адносіны з іншымі краінамі свету, эканамічнае,палітычнае , культурнае супрацоўніцтва . Праграма ўстойлівага развіцця ААН прадугледжвае асэнсаванне мэтаў устойлівага развіцця. А краіны ,якія з вялікай адказнасцю тавяцца да якасці жыцця свайго народа , знаходзяцца на высокім узроўні развіцця .І я з гонарам магуадзначыць актыўны ўдзел маёй Рэспублікі Беларусь у гэтай праграме.